I варыянт

1. Радзімай арабаў і рэлігіі іслам з'яўляецца:
а) Пірэнейскі паўвостраў; б) Аравійскі паўвостраў; в) Балканскі паўвостраў.

2. Якая з ніжэйпералічаных дзяржаў размяшчаецца на чатырох буйных і больш за чатыры тысячы малых астравоў:
а) Кітай; б) Індыя; в) Японія?



3. Каран – гэта: а) свяшчэнная кніга мусульман; б) звод законаў арабаў-мусульман; в) галоўны мусульманскі храм.

4. Унук Чынгісхана, заваёўнік Кітая – гэта:
а) Хубілай; б) Батый; в) Чагатай.

5. Якія плямёны стварылі ў сярэдневякоўі свае дзяржавы на тэрыторыі Амерыкі: а) майя; б) мексіканцы; в) тальтэкі; г) перуанцы; д) сапатэкі?

6. Устанавіце адпаведнасць:

а) Мухамед	1) вядомы кітайскі паэт;
б) Ібн Сіна	2) прадстаўнік японскай дынастыі сёгунаў;
в) Біруні	3) заснавальнік ісламу;
г) Ду Фу	4) вядомы сярэднеазіяцкі вучоны-астраном;
д) Хулагу	5) славуты вучоны-медык, аўтар твора "Канон";
е) Мінамота	6) унук Чынгісхана, заваявальнік Ірана.

7. Згрупуйце прапанаваныя паняцці:
а) тытулы правіцеляў:
б) рэлігіі:
в) індыйскія варны:

1) брахманы;
2) сінтаізм;
3) шах;
4) шудры;
5) канфуцыянства;
6) султан;
7) кшатрыі;
8) халіф;
9) будызм;
10) вайш'і;
11) індуізм,
12) імператар;
13) даасізм.

8. Растаўце ў правільнай паслядоўнасці:
а) спробы манголаў заваяваць Японію;
б) заваяванне манголамі Кітая;
в) узнікненне дзяржавы ў Японіі;
г) час праўлення ў Кітаі дынастыі Тан.



9. Аб'яднайце прапанаваныя паняцці ў адзіны сказ (ці тэкст):
мусульмане, Індыя, 1206 г., Дэлі, султан, іслам, індусы.

_____

LIVEWORKSHEETS



II варыянт

1. Першапачатковымі цэнтрамі ісламa, святымі гарадамі для мусульман з'яўляюцца: а) Багдад і Дамаск; б) Самарканд і Бухара; в) Мекка і Медына.

2. Ніпон – "Краіна узыходзячага сонца", так сваю дзяржаву называлі і называюць: а) японцы; б) кітайцы; в) індыйцы.

3. Халіф – гэта: а) тытул правіцеля Кітая; б) "намеснік прарока", правіцель арабскай дзяржавы; в) арабскі военачальнік.

4. Заснавальнік мангольскай дзяржавы, адзін з самых вядомых заваёўнікаў сярэдневякоўя: а) Джучы; б) Чынгісхан; в) Батый.



5. Якія дзяржавы з ніжэйпералічаных існавалі ў сярэдневякоўі на тэрыторыі Афрыкі:
а) Гана; б) Малі; в) Сахара; г) Нігер; д) Эфіопія; е) Канем?

6. Устанавіце адпаведнасць:

а) Фірдаўсі	1) вядомы кітайскі мастак;
б) Ван Вэй	2) славуты кітайскі паэт;
в) Хубілай	3) славуты персідскі паэт, аўтар паэмы "Шах-намэ";
г) Амар Хаям	4) заснавальнік сярэднеазіяцкай дынастыі качэўнікаў,
д) Лі Бо	якая ў XI ст. захапіла Сярэднюю Азіі і Іран;
е) Сельджук	5) мангольскі заваёўнік, імператар Кітая;
	6) вядомы іранскі вучоны, паэт, філосаф, матэматык.

7. Згрупуйце прапанаваныя паняцці:
а) араба-ісламскія свет
б) Індыя
в) Японія

1) Вішну;	_____
2) самурай;	_____
3) хадж;	_____
4) Кааба;	_____
5) Шыва;	_____
6) сёгун;	_____
7) мячэць;	_____
8) Брахма;	_____
9) халіфат;	_____
10) Дэлі;	_____
11) Фудзіяма;	_____
12) арабеска;	_____
13) "Мірыяды пялёсткаў".	_____

8. Растаўце ў правільнай паслядоўнасці:
а) узвышэнне ў Сярэдняй Азіі ўладароў Харэзма;
б) узнікненне ісламу;
в) заваяванне арабамі Паўночнай Афрыкі і Пірэнейскага паўвострава;
г) распад Арабскага халіфата.

9. Аб'яднайце прапанаваныя паняцці ў адзіны сказ (ці тэкст): манголы, пачатак XIII ст., Кітай, 70 гадоў, Хубілай, 1279 г., Пекін.

LIVEWORKSHEETS